НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 п. 6 (Wileńska 12, m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 9000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на 4 стрніцы 600 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 5 | Пятніца 15-га чэрвеня 1923 г. | Год I.

Панскія пагрозы.

Эндэцкія газэты наказуюць, што саюз паноў-земляўласьнікаў вельмі занепакоіўся працай клясовага саюзу сельска-гаспадарскіх работнікаў. Гэта — зусім натуральна і лёгка зразумела: пакуль нашы парабкі прадстаўлялі цёмную, неарганізованую масу, распыленую па панскіх дварох невялічкімі групкамі, датуль абшарнікі былі поўнымі панамі палажэньня і вычваралі з парабкамі, што толькі хацелі. Калі прыпомнім, прыкладам, варункі парабчанскае працы перад вайной, дык убачым, што ў тыя часы дзенны заработак парабка часта выражаўся сумай 6-10 капеек! Ня дзіва, што цяпер, дзякуючы вялізарным зьменам у нашым жыцьці пад уплывам расейскае рэвалюцыі, нашы парабкі кінуліся да самаарганізацыі, да гуртаваньня сваіх сіл і пляновае барацьбы за людзкія варункі працы. І арганізованая барацьба, кіраваная саюзам сельска-гаспадарскіх работнікаў, дае дужа добрыя вынікі, — ведама, добрыя для парабкаў, але вельмі няпрыемныя для абшарнікаў.

Арганізацыя парабкаў, як і ўсе клясавыя работніцкія арганізацыі, апіраецца на ўласныя сілы працоўнага народу. Дый хто-ж другі мог-бы ім памагаць у здабываньні неабходных дзеля кожнае грамадзкае працы грашовых заробкаў? Вось, і саюз сельска-гаспадарскіх работнікаў істнуе і працуе за тыя грошы, якія самахоць плацяць сябры яго ў саюзнаю касу. Гэткая незалежнасьць парабчанскае арганізацыі асабліва трывожыць нашых „ясна вяльможных“. Трывожыць тым балей, што, судзячы паводле газэтных справаздач аб дужа мізэрных сходах саюза абшарнікаў, самі абшарнікі, згнусьнеўшы ў бяздзейнасьці, да падобнае самастойнасьці зусім нявдольны, „ня ўмеюць барaніцца“.

Эндэцкі „Dziennik Wileński“ узяў на сябе абавязак навучыць „ясна-вяльможных“, якімі спосабамі змагацца з ненавіснай парабчанскай арганізацыяй. Газэта піша, што саюз сельска-гаспадарскіх работнікаў, апрача гадавое складкі ў ліку 4.000 польскіх марак (ах, як гэта многа!), пастанавіў узяць аднаразовую складку ў разьмеры паўтара пуда жыта ад кожнага сябры саюза. Вось, эндэкі і радзяць зямляўласьнікам, каб тыя не давалі сваім парабкам гэных паўтара пуда хлеба і такім спосабам адбілі-бы ў парабкаў ахвоту падтрымліваць свой прафэсыянальны саюз, свайго натуральнага абаронцу.

Эндэцкая рада мае чыста правакатарскі характар. Якое каму дзела, што зробіць парабак з зароблеными грашмі ці з сваім хлебам, — ці іх праесьць, ці прадасьць, ці аддасьць у саюз? Але эндэкі, якія цяпер узялі ў Польшчы ўладу ў свае рукі, хацелі-бы зрабіць паноў натуральнымі „апякунамі“ сваіх парабкаў, як было ў прыгонных часох. Дзеля гэтага, спадзяючыся на падтрыманьне нашага панства новым урадам, эндэкі і стараюцца падбіць абшарнікаў на варожае да парабкаў выступленьне, на рабунак парабчанскіх грошы, зароблених цяжкой працай, каб і з боку парабкаў выклікаць востры адказ, за каторы разгромяць арганізацыю сельскіх рабочаяў.

Выступленьне эндэцкае газэты вельмі сымптоматычнае: яно паказвае, як акрылялі надзеі нашых рэакцыйных кругоў грамадзянства ў сувязі з утварэньнем правага ўраду.

Няхай-жа работніцкія масы і іх арганізацыі будуць прыгатаваны да ўсялякіх наскокаў з боку „паноў палажэньня“! Няхай ня сьпяць, а напружаюць усе свае сілы, каб паход рэакцыі спыніць.

Лаўрыновіч.

Адраджэньне левіцы.

Цяперашні міністэрскі крызыс у Польшчы, дзякуючы якому ўлада перайшла ў рукі аб'еднанай правіцы, а так сама злучаная з ім адстаўка Пілсудзкага, трэба спадзявацца, урэшце паложаць канец ненармальным сацыяльна-палітычным адносінам, якія да гэтага часу панавалі у маладой польскай дзяржаве.

Бо ці-ж гэта нармальна, каб правіца, якая бязумоўна прадстаўляе найвярней настрої сярэдняй польскай масы, была заўсёды ў апазыцыі, а левіца выступала ў зусім неадпаведнай для яе ролі абаронцы істнуючага гаспадарственнага ладу?

Гэткія адносіны былі-б зразумелымі, калі-б польская палітыка як унутраная так і заграднічная запраўды мела характар шчыра-дэмакратычны і пазбаўлены імпэрыялістычных і нацыяналістычных адзнак. На гэта, аднак, левіца ня мае патрэбных сілаў. Ня маючы большасьці ў Сойме і не знаходзячы водгуку ў сьвядомых колах грамадзянства, прымушана была пастаянна ісьці на кампрамісы і падтрымліваць нявыразныя ўрадовыя праграмы, каб толькі не дапусьціць да ўлады эндэцыі, якая цяпер выступае аж пад трыма фірмамі: Zw. Lud. Narod., Jedn. Chrz.-Narod. i Chrz.-Dem., што ўсё разам на варшаўскай гутарцы мае скарочаную назову „хьена“.

Дзякуючы гэтаму правілі розныя цэнтравыя і непарлямэнтарныя кабінэты, па сутнасьці, вёўшыя палітыку ня менш рэакцыйную і нацыянальную, чым такія, якія-б былі зложаны з правых элемэнтаў; левіца-ж, падтрымліваючы іх дзеля страху перад эндэцкімі ўрадамі, аканчальна здэмаралізавалася і цалком страціла сваё ідэёвае аблічча.

Паўстае пытаньне: чаму левіца за ўсялякую цану, нават цаною далёка-ідучага опортунізму і ўкланеньня ад сваіх аснаўных праграмных прынцыпаў, не хацела дапусьціць да ўлады эндэцыі, калі было відавочна, што толькі невялічкая рожніца аддзеляе ідэолёгію ген. Сікорскага альбо праф. Новака ад паглядаў ген. Галлера, альбо праф. Глонбінскага? Адказ асны: ішло аб асобе Пілсудскага. Было ясна, што занадта напружаны адносіны паміж тварцом легіонаў а абозам парыскага Нацыянальнага Камітэту, каб паміж імі была магчымай якая-небудзь супольная праца.

Пераход улады да эндэцыі пазбавіў бы Пілсудскага магчымасьці рабіць уплыў на ход дзяржаўных спраў, эвэнтуальна змусіў бы яго зусім адмовіцца ад дзяржаўнай працы, што цяпер і наступіла. Польская-ж левіца, з P.P.S. уключна, да того пачуваецца зьвязанай з асобай Пілсудскага, што ягоныя ўдачы лічыць за свой трыумф, ягоныя няўдачы—за свой правал.

Дык вось пункт важкасьці сучаснага крызысу ляжыць ня стольскі ў утварэньні кабінэту Вітаса з удзелам паноў Сэйды і Глонбінскага, сколькі ў дымісіі маршалка Пілсудскага. Што цяпер пачне Пілсудскі? Гэтае пытаньне амаль што кожнага цяпер цікавіць. Ніхто ня ўяўляе яго сабе ў ролі Цынцынната. Аднак, што-б ён ня стаў рабіць, гэта будзе акцыя прыватнага чалавека і ні ў якім выпадку прадстаўніка ўраду ці дзяржавы.

Левіца-ж, будучы салідарнай з такой акцыяй Пілсудскага, падтрымліваючы і супрацоўнічаючы з ім застанецца на апазыцыйным становішчы, тым больш, што эндэцыя маючы ўладу ў сваіх руках, бязумоўна, пастараецца ачысьціць важнейшыя пасады ў адміністрацыі, дыплёматыі і арміі з элемэнтаў левых, якія апынуліся на тых, часта зусім неадпаведных для іх месцах, за часаў неагранічаных уплываў Пілсудскага.

Можа гэта паслужыць да ачышчэньня і аздараўленьне маральнай атмасфэры, у якой што раз трудней было дыхаць тым нямногім адзінкам, якія засталіся вернымі даўнейшым паняцьцям, пераконаньням і ідэялам. Ці-ж гэта ня ёсьць праявай глыбокай дэмаралізацыі выкананьне рожных „вывядоўчых“ і паліцэйскіх функцый праз нядаўных рэвалюцыянэраў і загаворшчыкаў? Бо ўсе-ж дэфэнзывы былі і бадай ёсьць перапоўнены спачуваючымі, а нават і чыннымі сябрамі P.P.S. і Wyzwolenia! Натуральна, што ні адзін прыхільнік свабоды перажыў эвалюцыю пераконаньняў альбо проста прыпала да спадобы на новым становішчу, становячыся з прасьледуемай ахвяры гарачым абаронцам і слугою сыстэмы рэпрэсый і уціску. Тых ужо наогул ня варта залічаць да левіцы. Але-ж апрача таго ня раз можна бачыць дзіўную мешаніну штабовых аксэльбантаў з чырвонай какардаю, перакіданьне ад адзін раз ад мундзіру да рабочай блюзы, так што ніколі ня можна было зразумець з кім маеш у даны мамэнт справу: з прадстаўніком улады, ці правакатарам, ці з агітатарам і загаворшчыкам, які імкнецца да зьнішчэньня істнуючага ладу?

Культ Пілсудскага ў шэрагах левіцы прывёў яе ў аканчальным вывадзе да культу мілітарызму наогул. Гэта-ж выклікала зноў тую ненармальную праяву, што правіца пачала выступаць у абароне правапарадку і цывільнай людкасьці перад самаволяй і грубасьцю вайсковых, што як-раз павінна было быць заданьнем левіцы. Затое-ж левіца найгаласней бразгала шашкай ува ўсіх выпадках гаспадарственнай экспансыі: калі справа йшла аб Віленшчыне, ці аб Шлёнску, ці аб Сьпіжу і Ораве.

Усё гэтае баламуцтва вынікла з агульнай прадпасылкі: беспасрэднага, ці пасрэднага ўдзелу левіцы ў ўрадах пры адначасным няхватку патрэбнае сілы, каб надаць гэтым урадам выразны левы кірунак. Гэтая палавінчатасьць фатальна адбілася на псыхіцы левых партый і не дапамагла так-сама да разьвіцьця дзяржавы.

Цяпер-жа, калі сытуацыя выясьнілася, калі людоўцы з партыі „Пяста“ адкінулі ўрэшце зьвязваўшы свабоду іх руху баласт радыкалізму, калі пасьля доўгіх высілкаў эндэцыя дарвалася да ўлады, а Пілсудскі прымушаны быў пакінуць урадуючыя сфэры, можна спадзевацца, што левыя элемэнты вернуцца да умысловай і маральнай раўнавагі і займуць адпаведную пазыцыю, з якой зыйшлі пад уплывам опортунізму і памылковага разуменьня, што яны могуць прадстаўляць сучасную Польшчу.

Відавочна гэта адразу ня станецца, але працэс у гэным кірунку бязумоўна будзе адбывацца— тым інтэнсыўнейшы, чым трывальшымі і безадноснымі будуць эндэцкія ўрады. Тады урэшце, магчыма, знойдуць водгук і падтрыманьне скромныя тэрытарыяльныя і культурныя пастуляты нацыянальных мяншасьцей, якія цяпер спатыкаюць поўную адсутнасьць зразуменьня, а нават адсутнасьць добрай волі з боку польскай левіцы, якая баіцца, каб яе не асудзілі, за адсутнасьць нацыяналістычных і імпэрыялістычных тэндэнцый.

(„Przeg. Wileński“).

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаем гэты артыкул, каб даць магчымасьць чытачам пачуць голас часткі польскай дэмакратыі, якая прызнае банкроцтва палітыкі т. з. польскай левіцы.

Палітычныя падзеі.

Францыя. Францускія манархісты пачалі ў апошніх часох зноў паднімаць галаву. Брудныя людзі заўсёды хапаюцца за брудныя спосабы барацьбы. Так і манархісты, кіраваныя Лявонам Додэ, пачалі арганізоўваць на вуліцах Парыжу напады на левых паслоў.

Гэтыя напады выклікалі страшэннае абурэньне ў францускім парлямэнце. Парлямэнт зразумеў, што гэта — ня просты бандызызм, а пагроза рэспубліканскаму ладу

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ У БЕЛАСТОКУ.

(Ад уласнага карэспандэнта)

ТРЭЦІ ДЗЕНЬ.

Дапрос сьведкаў.

Паседжаньне адчыняецца ў 10 гадз. 25 мін.

Прадседацель дае загад запрасіць сьведкаў для прысягі.

Большасьць сьведкаў сяляне, шмат хто з іх блізкія сваякі абвінавачаных бацькі, браты... Шэраг сьведкаў абвінавачаньня—агенты паліцыі. Большасьць—праваслаўныя, якіх прыводзіць да прысягі сьвяшчэньнік, католікаў—ксёндз; старабрадцы—даюць заместа прысягі „ўрачыстую абяцанку“.

Сярод упушчаных па білетам публікі—большасьць паліцэйскія ў форме і франтавіта адзетыя маладыя людзі з паненкамі. Па дзіўнаму прыпадку бадай усе знаёмы паміж сабою...

З прычыны выказаных сьвед. Сьцяпанам Нічыпаруком—бацькам абвінав. Аляксея Нічыпарука—адмовы быць сьведкам у справе сына, абарон. Міцкевіч просіць суд звольніць ад прысягі ўсіх сьвед.—сваякоў абвінавачаных, а таксама пазбаўленага правоў Тамашука.

Забыў успомніць, што пасьля прачытаньня акту абвінавачаньня, абаронаю была заўважана прысутнасьць у часе чытаньня акту абвінавачаньня ў залі суду сьведкі абвінавачаньня Тустаноўскага, агента тайнай паліцыі які і быў зараз-жа выдалены прадседацелем. Факт гэты на дамаганьне абароны быў занесены ў пратакол. Гэта дае падставу абар. Грушкевічу зьвярнуцца да суду з дамаганьнем не дапрашываць пад прысягай і гэтага сьведку, бо гэткага сорту сьведкі, як агент Тустаноўскі, зацікаўлены ў тым, каб даваць паказаньні згодна з актам абвінавачаньня. Пракурор спрацiўляецца. Суд удаляецца і хутка выносіць рэзалюцыю: звольніць ад прысягі сваякоў абвінавачаных і Тамашука; хадатайства абар. Грушкевіча—адхіліць.

Абар. Врублеўскі просіць суд дапрасіць першым пасла Рака-Міхайлоўскага, якому трэба сёньня вечарам выехаць на паседжаньне Сойму ў Варшаву. Суд задавальняе гэтае хадатайства.

Сьведка Рак-Міхайлоўскі.

Пасол Сойму.

Абарон. Якавюка і Баранава *Врублеўскі*. Скажэце, сьведка, вы былі ў Горадні сябрам Белар. Нацыян. Камітэту, што вы можаце расказаць нам пра гэты Камітэт?

Рак-Міхайлоўскі. Так, быў сябрам яго ад самага заснаваньня, ў летку 1920 г. у часе Zarz. Główn. Ziem Wschodnich Асмалоўскага Камітэт істнаваў да прыходу бальшавікоў. У часе бальшавікаў Камітэт не функцыянаваў. Баранаў і Якавюк, як стаяўшыя на чале гэтага Камітэту, меўшага нацыянальны—„буржуазны“ характар, былі арыштованы і ў часе адступленьня бальшавікоў вывезены з Горадні ў кірунку Ліды. Пасьля заняцьця Горадні польскімі войскамі я сам атрымаў дазвол уладаў на ўзнаўленьне дзейнасьці Камітэту. Істнаваў Камітэт да студзеня 1921 г., як філія галоўнага Камітэту ў Варшаве з Дубяйкоўскім на чале. Ці былі потым Баран і Якавюк сябрамі Камітэту ня ведаю.

Врублеўскі. Ці Камітэт гэты выпускаў якія-небудзь адозвы?

Р.-Міхайл. Так, адозвы выпускаліся з дазволу польскіх уладаў і друкаваліся ў беларускіх газэтах.

Врубл. Сьведка рэдагаваў беларускія газэты?

Р.-Міхайл. Так, я быў рэдактарам газ. „Беларускае Слова“.

Врубл. Значыцца Белар. Каміт. быў лягальным?

Р.-Міхайл. Зусім лягальны і нават карыстаўся падтрыманьнем польскіх уладаў.

Прадс. прад'яўляе сьвед. прыпісываемую Бел. К-ту ў Горадні адозву.

Гэтая адозва ад імя Бел. Нац. К-ту ў Горадні прызывае сялян прыслаць у Горадню па 3 прадстаўнікі ад гміны ўсіх паветаў Горадзеншчыны на зьезд, які меў заданьнем арганізацыю народнай улады, скліканьне Устаноўчага Сабраньня і ўтварэньне незалежнай ад Польшчы Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтая адозва была-б важным довадам анты-польскай рэвалюцыйнай дзейнасьці К-ту і ягонага прэзыдыуму на чале з Барановым. Але адозва памечана толькі датай 15/XII без паказаньня году. Без усялякіх падставаў акт абвінавачаньня адносіць „адозву да сялян“ да часу польскага ўладанння ў Горадзеншчыне. Ужо адно, што гэтая адозва—на расейскай мове—робіць няпэўным яе выданьне праз Белар. К-т пры польскай уладзе.

Рак.-Міхайл., азнаёміўшыся з „адозвай“ заяўляе, што гэтакіх адозваў Камітэт ніколі ня выдаваў. Ні аб якіх запросінах Камітэтам сялян на зьезд ён ня чуў. Усе адозвы Камітэт выдаваў пабеларуску, з дазволу ўладаў, паслугоўвацца тады расейскай мовай было проста не магчыма.

Абар. Врубл. Ці сьведка зьвярнуў тут увагу на пералічэньне паветаў; у „адозве“ паказаны паветы: Алешкоўскі і Дзятлаўскі. Ці ня ведае сьведка, ці былі такія паветы ў Горадзеншчыне пры польскай уладзе?

Р.-Міхайл. Добра ня ведаю.

Абар. Врубл. Зварачываю ўвагу суду на тое, што гэтыя два паветы, паказаныя ў „адозве“, істнавалі толькі пры нямецкай акупацыі і ў першыя часы пры бальшавіках.

Абар. Врубл. Сьведка сам ня быў у Празе на зьездзе, але магчыма, як рэдактару газэты вам вядома аб ім падробна. Ці друкавалася што-небудзь аб зьездзе, ягоныя рэзалюцыі ў беларускіх і польскіх газэтах?

Р.-Міхайл. Рэзалюцыі былі надрукованы ў беларускіх газэтах у Вільні і ў „Gazecie Krajowej“.

Абар. Врубл. Ці ня ведаеце, рэзалюцыі гэтыя былі прыняты на пленуме, ці ў сэкцыях.

Р.-Міхайл. Добра ня ведаю, але раз друкаваліся ад імя зьезду, думаю, што былі зацьверджаны пленумам.

Абар. Бабянскі пытаецца, калі пачаўся беларускі рух на карысьць незалежнасьці і як ён разьвіваўся, якія былі палітычныя зьезды і арганізацыі?

Р.-Міхайл. расказвае аб тым, што зараз-жа пасьля расейскай рэвалюцыі пачаліся зьезды беларускіх партый і арганізацый; заснаваліся нац. к-ты, вайсковыя камітэты на ўсіх фронтах. Пасьля ўжо пры бальшавіках адбыўся ў Менску грандыёзны Усебеларускі зьезд, на якім было больш 2000 асоб. Зьезд выбраў прэзыдыум, які ўжо пры немцах дапоўніўся прадстаўнікамі земстваў і гарадоў, палітычных партый і нацыянальных арганізацый краю (ў тым ліку і палякаў), стварыўшы Раду Белар. Народн. Рэспублікі, якая 25 сакавіка 1918 г. выдала Устаўную Грамату, абвясьціўшы Незалежнасьць Беларусі. Пасьля ў склад Рады ўвайшлі і выбраныя на месцох прадстаўнікі Віленшчыны і Горадзеншчыны.

Абар. Бабянскі. А калі прышлі ў Менск палякі, што сталася з гэтымі арганізацыямі?

Р.-Міхайл. Тады прэзыдыум выехаў загранiцу. Застаўшыяся арганізацыі, як Нац. Каміт. у Менску займаліся культурна-асьветнаю справаю, адчынілі 23 школы, зарганізавалі вучыцельскія курсы—гэтаму Рачкевіч перашкодаў ня чыніў.

Абар. Бабян. Сьведка, як сябра Белар. Вайсковай Камісіі знаёмы з гэтай арганіз. Чым яна займалася?

Р. Міхайл. Я быў у складзе Бел. Вайск. Кам. ў часе Асмалоўскага. Яна займалася камплектаваньнем асобных беларускіх вайсковых аддзелаў. Камісіі былі ў Менску, пасьля ў Вільні і Горадні, у двох апошніх гарадох працавалі слабей.

Абар. Бабян. Значыцца, былі беларускія войскі. А якое было камандаваньне?

Р.-Міхайл. Аддзелы ўваходзілі ў склад польскай арміі; у ліку камандзіраў былі палякі, але афіцэры, пачынаючы з палкоўніка былі беларусы; каманднай мовай была беларуская. На агульнадзяржаўны кошт выдаваліся уставы вайсковай службы на беларускай мове. Словам справа была пастаўлена на шырокую ногу.

Абар. Бабян. А ці гэтыя аддзелы прыймалі ўдзел у вайне?

Р.-Міхайл. Так.

Абар. Бабян. А што пасьля сталася з Камісіяй і з гэтымі аддзеламі?

Р.-Міхайл. Пасьля Камісія выехала да Лодзі ў часе наступу бальшавікоў. А за часаў ген. Жэлігоўскага ўся праца спынілася.

Абар. Бабян. Як аднесьліся беларусы да Рыскага Трактату? Ці былі выданы якія-небудзь адозвы?

Р.-Міхайл. Усе беларускія партыі і арганізацыі горача пратэставалі проціў Рыскага падзелу Беларусі. Віленскі і Горадзенскі Нацыян. К-ты вынеслі рэзалюцыі пратэсту.

Абар. Бабян. А зьезд у Празе меў адносіны да Рыскага Трактату?

Р.-Міхайл. Самае беспасрэднае: ён быў скліканы, каб выказаць пратэст беларусаў проціў трактату перад абліччам усяго сьвету і абмяркаваць стварыўшаяся палажэньне.

Абар. Бабян. Ці былі перад зьездам аб'яўлены ў прэсе тэрмін зьезду і ягоная праграма?

Р.-Міхайл. Так, у польскай і беларускай прэсе; нават у газэце Аляксюка „Jednaść“.

Абар. Бабян. Ці былі на зьездзе, апрача дэлегатаў, беларускія дзеячы пэрсанальна?

Р.-Міхайл. Так, былі.

Абар. Бабян. А зьезд у Празе меў якую-небудзь сувязь з тым рухам і тэй арганізацыяй, аб якой ідзе мова ў цяперашнім працэсе,—з аружным паўстаньнем?

Р.-Міхайл. Не, ні на зьездзе, ні ў ягоных рэзалюцыях аб аружным паўстаньні ня было мовы. Гэты рух распачаўся на грунце нацыянальнага і школьнага уціску. Калі польская ўлада перш хоць толькі „толеравала“ беларускі рух, нічога падобнага было не магчыма.

Аб. Бабян. Якая палітычная пазыцыя Беларускага Клюбу ў Сойме?

Прадс. Я не магу дапусьціць непатрэбнага для справы расшырэньня пытаньня.

Аб. Бабян. Я дамагаюся дазволу атрымаць адказ на гэтае пытаньне. Для мяне важна паказаць, што цяпер беларускі рух перайшоў у новую фазу—мірнай канстытуцыйнай дзейнасьці ў абароне сваіх нацыянальных правоў, калі рэвалюцыйны характар барацьбы траціць пад сабою грунт.

Прадс. Для суду не важны палітычныя пагляды сьведкі і іншых паслоў. Гэта ня мае беспасрэдных адносін да працэсу.

Аб. Врубл. Ці ня было, апрача пратэсту, скіраванага проціў Польшчы, так сама і іншых пратэстуючых рэзалюцый і адозваў—проціў другіх дзяржаў, да якіх адышлі часткі жывога цела Беларусі? Бо гэтакіх дзяржаў, што зрабілі падзел Беларусі аж пяць: Расея, Польшча, Сав. Беларусь, Літва і Латвія.

Р. Міхайл. Безумоўна былі. Былі рэзкія пратэсты проціў Берасьцейскага міру. На Пражскім зьезьдзе пратэставалі проціў Польшчы, але і проціў Расеі. Ідэя непадзельнай Беларусі абхоплівае яе ўсю палком ува ўсіх заборах.

Пракурор. Сьведка ня ведае, ці быў Баранаў у Горадзенскім Рэв-Коме ў часе бальшавікоў?

Р.-Міхайл. Не, ён быў у «Юрыдычным аддзеле».

Пракурор Але-ж ён быў старшынёю гэтага аддзелу, а на такія мейсцы назначаюцца толькі адказныя работнікі—свае адданыя, заслугоўваючыя даверыя людзі.

Р.-Міхайл. Не абавязкова. Тады ў першыя часы бальшавікі назначалі асоб, якія знаюць мяйсцовыя варункі і спэцыялістаў.

Пракурор. Але-ж які Баранаў спэцыяліст? Няўжо-ж не знайшлося для гэтакай справы настаяшчага юрыста?

Р.-Міхайл. Баранаў па сваей папярэдняй дзейнасьці прыватнага паверанага меў некаторую веду і досьлед у гэтай справе.

Прак. А ці былі ў Горадні разстрэлы? І ці меў Юрыд. Аддзел адносіны да Рэв. Трыбуналу, які прыгаворваў да разстрэлаў?

Р.-Міхайл. Аб разстрэлах чуў, але Юрыдычны аддзел ніякіх адносін да Трыбуналу ня меў. Апошні ўваходзіў у кампэтэнцыю *ваенных уладаў*, а Юрыдычны аддзел быў *чыста цывільнай установай*, займаўся рэгістрацыяй спэцыялістаў і г. д. Пры Баранаве ён толькі пачаў фармавацца і нічога яшчэ не зрабіў.

Прак. Сьведка ня ведае, ці ўрад Ластоўскага мае рэвалюцыйны характар?

Р.-Міхайл. Так, ён утварыўся галоўным чынам дзякуючы партыі белар. сацыялістаў-рэвалюцыянэраў.

Прак. Ня ведаеце, ці меў Баранаў ад ураду Ластоўскага пашпарт?

Р.-Міхайл. Ня ведаю.

Прак. Ці ня ведаеце, каму Ластоўскі выдаваў свае пашпарты?

Р.-Міхайл. Таму, хто езьдзіў за граніцу і вёў дзейнасьць ад імя ягонага ўраду.

Прак. Просіць запісаць гэтае ў пратакол.

Аб. Врубл. Гэта вы, сьведка, кажаце аб дыплёматычных пашпартох. Ну, а звычайныя пашпарты, звычайным грамадзянам Беларускай Народнай Рэспублікі ці выдаваліся ўрадам Ластоўскага?

Р.-Міхайл. Гэткія пашпарты выдаваліся тым, хто варочаўся на Беларусь і ня меў ніякага дакумэнту. Такія-ж самыя пашпарты ці пасьведчаньні выдаваў і нацыянальны Камітэт Дубяйкоўскага ў Варшаве з ведама польскіх уладаў.

Аб. Врублеўскі просіць і гэтае запісаць у пратакол.

Пракурор. Але рожніца паміж пашпартам Ластоўскага і пасьведчаньням Дубяйкоўскага была якая-небудзь?

Р.-Міх. Добра не магу сказаць; думаю, што першы меў форму кніжачкі, а другі—на бланках і, ведама-ж, у падпісах. Але і тыя і другія выдаваліся грамадзянам Беларускай Народнай Рэспублікі.

Прак. Ці ня чуў сьведка, што Баранаў атрымліваў інструкцыі ад Ластоўскага?

Р.-Міх. Ня чуў.

Прак. Ці ня ведама паслу сьведцы, што Баранаў і цяпер, будучы паслом, вядзе агітацыю па вёскам заклікаючы да паўстаньня проціў Польшчы?

Р.-Міх. Не, гэта немагчыма. Гэтага не павінна быць.

Прак. Пэўна-ж, не павінна быць, але даведзена ўладамі.

Р.-Міх. Не, ў клюбе ёсьць устаў і дысцыпліна, якая не дапушчаюць гэтага.

Прак. Але магчыма, што магла быць нарушана дысцыпліна, устаў?

Р.-Міх. Не, тады Баранаў быў-бы выключаны з Клюбу.

Прак. Ці ведама сьведцы, што Генаральная пракуратура дамагалася ад Сойму згоды на зарыштаваньне пасла Баранава?

Р.-Міх. Так, Бел. Клюб, пэўна-ж ведаў гэтае і ў свой час унёс прапазыцыю да Сойму аб „zawieszeniu postępowania karnego“ проціў пасла Баранава.

Прак. Але-ж калі гэтая прапазыцыя была пастаўлена на абмеркаваньне ў юрыдычную камісію. Бел. Клюб сам зьняў сваю прапазыцыю, адмовіўшыся, відавочна, ад думкі рабіць перашкоды суду ў прасьледаваньні праступнага пасла.

Р-Міх. Клюб зьняў у юрыд. Кам. сваю прапазыцыю не дзеля гэтага...

Абар Врублеўскі. Беларускі Клюб зьняў сваю прапазыцыю пасьля таго, як выявілася яе бязмэтнасьць, з тэй прычыны, што ў камісіі павінна была своечасна разглядацца прапазыцыя Мін. Справядлівасьці аб прымяненьні да Баранава вымагаемай Генар. пракуратурай меры прасячэньня.

Прак. выясьняе, што трэба разрожніваць дзьве рэчы: вымаганьне аб выдачы пасла суду, якое мае месца ў выпадку праступленьня, зробленага паслом да атрыманьня пасольскага паўнамоцтва, зусім-жа ня патрэбна згода Сойму, каб пацягнуць пасла пад Суд, за праступленьні зробленыя да яго выбару ў Сойме; тады можа быць толькі мова аб прымяненьні тэй ці іншай меры прасячэньня: арышту і г. д. і прывядзеньня прыгавару ў выкананьне.

Аб. Врубл. Гэта так, але Клюб зьняў сваю прапазыцыю, калі выясьнілася, пасьля выясьненьняў Мін. Справядлівасьці, што Баранаў пріцягіваецца да Суду за дзейнасьць, зробленую да атрыманьня пасольскага паўнамоцтва і раз у камісіі павінна была абмяркоўвацца прапазыцыя Ген. Прак. аб арышце паслоў, прапазыцыя Клюбу аб „zawieszeniu postępowania“ была непатрэбна. Дзеля гэтага зьняць прапазыцыю было актам простай тэхнічнай патрэбы. Раз стала ясным, што пытаньне аб паслох вырашыць аканчальна камісія толькі пры абмеркаваньні прапазыцыі Генар. Прак., дык усялякае рашэньне Камісіі па прапазыцыі Белар. Клюбу было-б нявыразным і магло быць вытлумачана ў непажаданым для Клюбу сэнсе.

Пасьля перарыву прадседацель прапануе абвінавачаным задаваць пытаньні сьвед. Рак-Міхайлоўскаму.

Вера Маслоўская. Калі Беларускі Клюб бярэ на сябе абавязак бараніць правы і інтарэсы Беларускага народу, тады мы будзем вясьці сваю дзейнасьць легальна.

Прадс. Гэта заява, а ня пытаньне.

Абаронца Бабянскі напамінае, што закон дае права абвінавачаным пасьля дапросу сьведкі, задаваць апошняму пытаньні і рабіць з паводу яго паказаньняў заявы. Просіць даць магчымасьць абвінавачаным высказацца.

Маслоўская паўтарае сваю думку ў форме пытаньня Р.-Міхайлоўскаму, які адказывае, што ў абароне Беларускага народу ляжыць увесь сэнс прысутнасьці беларускіх паслоў у Сойме. Паслы хочуць верыць, што іх праца ў Сойме палепшыць быт беларускага народу.

Сьвед. Мар'яна Божым.

Жонка забітага пры нападзе на паліцэйскі пастарунак у Кляшчэлях паліцыянта.

Бачыла яна ўсіх учасьнікаў нападу, бо ле трымалі, а каля яе праходзілі ўсе; але сярод прад'яўленых ёй прысутных абвінавачаных няпрызнае нікога. Ведае, што Рошчэнка браў удзел у нападзе, але гэта ня гэты, а ягоны брат.

Сьвед. Эдвард Ленкевіч.

Ж. м. Саколкі.

Галоўны сьведка абвінавачаньня, які ня толькі выкрыў, але на пачатку ў значнай меры, стварыў і разьвіў арганізацыю. Уся заля суду з напружанай увагай слухае гэтага гастролёра артыста utriusque artis, „рэвалюцыі“ і правакацыі, — калі не галоўнага рэжысэра, дык у кожным выпадку — „першага любоўніка“ ўсей гэтай „раскошнай пастаноўкі“ беларускай народнай драмы на беластоцкай сцэне.

Гэта—сухарлявы малады чалавек, з сухім, жылястым, гэмораідальнага колеру, пазбаўленым расьліннасьці тварам „конскага складу“. Гаворыць свабодна, хутка арыентуецца ў пытаньнях, спрытна адбівае удары, пры гэтым імкнецца да пераходу ў наступленьне. Гэтая апошняя тактыка, як пабачым далей, — пры вочнай стаўцы з сьвед. Зямкевічам,—адыграла фатальную ролю для яго самога...

Сваю ролю знае цьвёрда, уверана падгатаваўся да ўсяго... толькі не да таго, што на судзе будзе выкрыта, што ён бyўшы дзеяльны агент менскай чразвычайкі.

Сьвед. Ленкевіч. Вярнуўшыся з Расеі і, маючы сякія-такія срэдствы, жыў у Саколцы. У пачатку сьнежня 1921 г., неяк зайшоўся да мяйсцовага крамніка Аляксандра Гораша, які ў размове сказаў мне, што маладому чалавеку, як я, трэба болей зарабляць грошай... што я магу зарабіць шмат грошай, калі ўвайду ў арганізацыю.. Бачучы, што я не адмаўляюся, запрасіў мяне ў бліжэйшую нядзелю прыці да яго ў крамку, дзе абяцаў пазнаёміць мяне з аднэй кабетай, якая высьвятліць мне ўсю справу. У нядзелю я застаў у Гораша гэтую асобу, якая назвала сябе Верай Маслоўскай, беларускай вучыцелькай. Маслоўская ў яскравых фарбах намалявала польскі уціск на Беларусі, гаварыла аб неабходнасьці аружнага паўстаньня, і запрапанавала мне ўвайсьці ў арганізацыю, меўшай на мэце адарваць Беларусь ад Польшчы. Гаварыла папольску і парасейску...

Прадс. Дык яна гаворыць папольску?

Ленкевіч. Надта добра... Я запытаўся, якая будзе мая роля. Яна адказала, што ўжо ёсьць шэраг партызанскіх аддзелаў у рожных пунктах, што я буду назначаны начальнікам такога вялікага пункту, для вэрбоўкі і падрыхтоўкі аддзелу. Я адразу не паверыў. Тады яна сказала, што едзе цяпер у Мэрач—у штаб IV групы і запрапанавала ехаць разам. Я адмовіўся, Тады яна сказала, што ў Мэрачы запіша мяне ў арганізацыю, а пасьля прыезду зноў пабачыцца са мною. Я згодзіўся.

Праз нейкі час яна вярнулася і, пабачыўшыся са мною, паказала прывезеныя з Штабу грошы тысяч каля 200 марак, паведаміла мяне аб маім назначэньні начальнікам Сакольскага пав., дала загад каманданта Хмары № 1, у якім паказаны абавязкі начальніка павету і дала 30.000 марак. Калі я прыняў назначэньне, яна падрабязна расказала мне, што вымагалася ад мяне, якую работу вяла арганізацыя. Вымагалася вэрбаваць маладых людзей у беларускую армію, якая фармавалася ў Літве, ствараць на мяйсцох патаёмна аддзелы партызанаў, зьбіраць для іх і перахоўваць у пэўных мяйсцох аружжа, вясьці разьведку аб аружных сілах Польшчы, выклікаць і абастраць нездавольства люднасьці польскай уладай. Маслоўская дала мне шэраг канспіратыўных адрасоў, расказала, як трэба ехаць у Мэрач, як наогул робяцца зносіны паміж мяйсцамі і Штабам.

Праз нейкі час да мяне зноў прышоў Гораш з нейкім сябрам ураду Ластоўскага (пасьля выявілася, што гэта Косіч) далі яшчэ каля 20,000 марак і сказалі, што Хмара вымагае майго прыезду ў Мэрач. Пакінулі мне яшчэ загады Хмары і бланк ведамасьці аб састаяньні партызанаў. Ехаць трэба было, каб атрымаць для Сакольскага пав. аружжа, грошы і г. д. Жадаючы бліжэй азнаёміцца з арганізацыяй, я згадзіўся. Мне сказалі, што трэба ехаць у Горадню, зьвярнуцца там да вучыцеля беларускай школы Парука. Угаварыліся зьехацца 10 лютага. За гэты час Гораш познаёміў мяне з сястрою Маслоўскай Аўгеняй Матэйчук, якая пазнаёміла з сбосабам пераезду граніцы, дала мне адрас Грыгаса ў в. Даржэлі блізка ст. Марцінканцы. Трэба было Грыгасу сказаць, што прыслала сястра Вера.

У назначаны дзень я зьявіўся да Парука, дзе спаткаўся з Косічам і яшчэ нейкім Карповічам, які варочаўся з Мэрача і вёз адтуль розныя рэчы, якія паказаў мне Парук. Гэта былі шапірограф, ручныя гранаты, рэвальвэры. Пасьля гэтага я паехаў да Грыгаса. Прыбыўшы ў Даржэлі я зьвярнуўся да Грыгаса. Ён сказаў, што пераехаць трудна, але папрасіў зайсьці да хаты і пагаварыць. Толькі я увайшоў у хату, як з суседняга пакою дзьверы раптам адчынілася, і я знайшоўся перад дуламі скіраваных на мяне трох рэвальвэраў. Думалі, што я польскі шпіон і, відаць, хацелі прыкончыць. Але пасьля справа выясьнілася і ў ночы я і яшчэ чатырох узброеных маладых хлапцоў разам з Грыгасам свабодна перайшлі граніцу. Па дарозе спаткалі пешахода, відавочна, дзеяча тэй-жа арганізацыі, бо ён, прыняўшы нас за паліцэйскі патруль, парваў нейкія документы. Патрулёй ня было. Прыбыўшы ў Штаб, спаткаліся там з самым Камандантам групы—Хмарай. Там-жа быў і яго начальнік Штабу палкоўнік Волошын і яшчэ літоўскія афіцэры.

Хмара коратка абзнаёміў мяне з палажэньнем справы, запрасіў на заўтра на сабраньнэ, дзе будуць усе прадстаўнікі Штабу. На сабраньні Хмара нарысаваў плян дзейнасьці арганізацыі, якая да вясны павінна падгатаваць на Беларусі аружнае паўстаньне, а пакуль што стварыць аддзелы партызанаў і састаўляць сьпіскі польскіх афіцэраў і паліцыі, каб у патрэбны момант іх забіць. Казалі, што аружжа закуплена і хутка будзе дастаўлена. Арганізацыю падтрымлівае Літва і Нямеччына. Шмат аружжа закапана немцамі ў мейсцах, якія вядомы арганізацыі. На стале ў часе паседжаньня былі разложаны карты, на якіх адзначаны чырвоным алаўком рожныя пункты, з паметкамі, дзе колькі партызанаў, колькі польскіх войск, паліцыі, жандараў, колькі паравозаў. Усе гэтыя весткі канцэнтраваліся ў так званай палітоўску „Цэнтровальдыбэ“, Гэтай разьведкай кіраваў б. расейскі афіцэр Косіч.

На паседжаньне прыехала Вера Маслоўская і Тамашук Андрэй. Мне запрапанавалі застацца на службе ў Мэрачы і ехаць на зьезд у Коўню, які склікалі Ластоўскі, Варонка і др., але я адмовіўся. Сказаў, што можа другім разам, калі прыеду, пагаворым аб гэтым.

У Мэрачы быў вялікі склад аружжа ў рэквізаваным прыватным памешканьні. Шмат было піраксаліну, машын для ўзрыву мастоў, розных ядаў, як цыян-калі, стрыхнін...

Прадс. На што?

Лянкевіч. Для партызанскай работы. Мне казалі там, што адзін чалавек з дапамогай невялікай порцыі труцізны можа атруціць цэлы полк, кінуўшы яе ў кацёль, дзе варыцца яда, альбо ў колодзезь. Казалі, што аднэй шашкай піраксыліну можна ўзарваць цэлы паравоз.. Паравоз стаіць, печ адчынена—падышоў дый кінуў у печ... (Яўная брахня: кінутая ў агонь піраксылінавая шашка проста згарыць; каб яна ўзарвала, трэба яе самую ўзарваць капсулем). Быў план адразу узарваць усе масты. Паўстаньне павінна было распачацца ўсюды разам,—стварыць усюды панічную трывогу, тэрарызаваць войска і ўладу, ўнесьці забурэньня... І тады беларуская і літоўская арміі пяройдуць граніцу і дакончаць справу...

Усё гэта гаварыў Хмара. . .

Хмара-ж даў усім грошай. Атрымалі і мы трое: я, Маслоўская і Андрэй Тамашук па некалькі тысяч нямецкіх марак Тут-жа абьясьнілі, што трэба вясьці рахунковасьць, састаўляць ведамасьці, „лісты платы“ . . . Па гэтым лістам потым Штаб выплачваў грошы. Там казалі, што Маслоўская часта езьдзіць ў Штаб, як галоўная арганізатарка, што Аўгеня Матэйчук езьдзіла, як кур'ер арганізацыі. Казалі, што ёсьць два вагоны аружжа, якое перавозіцца ў Пушчу. . .

Гаварыў у Штабе сам Хмара, што Якавюк узяў у яго 70.000 ням. марак, абяцаў закупіць аружжа і ўзброіць штось-ці 30 ці 60 тысяч чалавек, але што з імі зрабіў ня ведама. На маю прапазыцыю ўцягнуць у арганізацыю і Баранава, як віднага дзеяча ў Горадзеншчыне, Хмара сказаў, што Баранаў, як ён ведае, фантазёр; гэта—паэт, і для справы некарысны. Тут-жа гаварылі, што калі хто выдасьць арганізацыю, альбо ня будзе выпаўняць сваіх абавязкаў, дык ня міне кары.

З Мэрача Косіч паехаў у Коўню, а адтуль заграніцу. А мы ўтраіх паехалі назад. Перавёз нас Грыгас; казалі, што ён вазіў цэлымі вазамі агітацыйную літэратуру ў часе Віленскага Сойму. Ен казаў, што можа правезьці праз граніцу цэлы полк. Ен рабіў, калі каго трэба было правезьці, так: запрашаў праезджаўшы патруль у карчму, напойваў яго . . . і тады граніца была адкрыта. У Грыгаса я бачыў бомбы, аружжа . . . Ен перавозіў усё гэта.

У Горадні зноў быў у Парука, расказаў яму аб паездцы і спаткаўся тут з Астроўскім. Парук пазнаёміў з ім, як з начальнікам Крынскага раёну. Павінен быў пры паўстаньні заняць Саколку. Астроўскі падцьвердзіў гэтае і Парук тут-жа даў яму 5.000 марак. Вярнуўся дамоў, ня ведаючы што рабіць з гэтымі паперамі, што атрымаў у Штабе. Тады паехаў у Беласток і заявіў аб усім паліцыі.

На пытаньні прадседацеля называе яшчэ шэраг сябраў арганізацыі, найбольш відных, у тым ліку Жабінскага, Трыпуза, Маслоўскую, Шыманюка Гэрмана і інш. Усё гэта былі начальнікі раёнаў, якіх назначыў Хмара. На чале арганізацыі стаяла Маслоўская, як арганізаваўшая ўсю Горадзеншчыну. Заступнікам яе быў Кастусь Матэйчук. Яна казала, што, як кабета, ня ўсё можа зрабіць,—патрэбны мушчына. Далей называе Гораша, Мікалая Паўлоўскага. Гораш паказаў яму шэраг другіх асоб, якіх можна завэрбаваць у арганізацыю, як Жамойду, які адразу ўвайшоў; Андрея Каляду, які быў ні тое, ні сёе і перш вагаўся.

Судзьдзя Здроевскі. Як дзялілася ўся беларуская арганізацыя?

Ленкевіч. Усімі арганізацыямі кіраваў Ковенскі цэнтр. Было чатыры групы. Штабы гэтых чатырох груп знаходзіліся ў Коўні, у Аранах, у Уцянах і ў Мэрачы. Да Мэрацкага цэнтру належала; і ўся Горадзеншчына. Перш належала да арганізацыі, на чале якой Аляксюк.... На чале IV групы стаяў літоўскі афіцэр Разумовіч-Хмара...

Судзьдзя Здроевскі (чуць ня крыкнуўшы) як, Аляксюк?!..

Ленкевіч. Ня гэты, ён—за Польшчу, а гэта яго родная сястра. Яна ў Арганізацыя дзялілася на чатыры групы: (гаворыць тое, аб чым мы ўжо пісалі, пераказываючы зьмест акту абвінавачаньня).

Судз. Здроев. Ці ня чуў сьведка аб якіх-небудзь іншых беларускіх арганізацыях?

Ленк. Так, у Віленшчыне было шмат блізкіх арганізацый, з якімі ўваходзілі ў сувязь, як «Зялёны Дуб» і інш.

С. Здроев. Дзе пазнаёміліся з Аўгеняй Матэйчук?

Ленк. У іх на кватэры.

С. Здроев. Дзе пазнаёміліся з Астроўскім?

Ленк. У Парука, як я ўжо казаў.

С. Здроев. Аб Грыгасе гаварылі ў Штабе?

Ленк. Але-ж. Казалі, што гэта—самы верны чалавек, добра працуе. Надта паніла.

С. Здроев. Там-жа чулі і аб Трыпузе, Жабінскім?

Ленк. Але.

Прадс. паказывае Ленкевічу шэраг перададзеных ім паліцыі дакумэнтаў: загады, бланкі і г. д.

Ленк. выясьняе, якія з іх атрымаў ад Косіча, якія ад Карповіча ў памешканьні Парука, ад Маслоўскай, Аўгені Матэйчук. Затым выясьняе, якім шыфрам карысталася арганізацыя і як карыстацца ключом да яго, паказаным у лемантары „Зорка“. Шыфр-просты, цыфры паказваюць страніцы і строчкі літар у табліцы.

Сьведцы пачарзе паказываюць усіх тых абвінавачаных, якіх ён назваў у паказаньнях. Асабіста знае ня ўсіх. Аб некаторых толькі „чуў у Штабе“.

Пракурор. Ці былі ў сьпісках партызанаў і „лістах платы“ так зв. „мёртвыя душы“, г. е. фіктыўна запісаныя, каб атрымаць за іх грошы ў Штабе?

Ленк. Ня ведаю. Але магчымасьць гэтага прадбачылася ў Штабе; там быў намечаны інспэктар, які павінен быў аб'ехаць раёны і на мяйсцох праверыць сьпіскі і наагуль састаяньне арганізацыі партызанаў. Але фактычна гэткі кантроль зроблены ня быў.

Абар Славінскі. Значыцца, сьведка напэўна ня можа сьцьвердзіць, што ўсе тыя, хто запісаны на гэтых „лістах“ фактычна былі ў арганізацыі. Была-ж магчымасьць надужыцьцяў і проста ашуканства?

Ленк. Я ня ведаю.

Прак. Але-ж ці-ж былі выпадкі хвальшывай запісі на „лістах“?

Ленк. Я такіх выпадкаў ня знаю.

Прак. Склады аружжа, што сьведка бачыў у Мэрачы, празначаліся спэцыяльна для беларускіх партызанаў гэтай арганізацыі?

Ленк. Той, што я бачыў, спэцыяльна празначаны быў да IV групы. Другія склады былі для літоўскай арміі.

Суд. Здроевскі. Ці ня вымагаў Штаб насамперш падробнай інфармацыі адносна афіцэрскага складу польскай арміі, вестак аб распалажэньні войск і г. д?

Ленк. Так, гэтыя весткі вымагаліся насамперш,

С. Здроев. Ці не гаварылі ў Ш табе аб Якавюку, што ён працаваў на два фронты?

Ленк. Так, аб гэтым гаварылі. Наогул казалі, што чалавек ён няпэўны.

С. Здраев. Калі Якавюк атрымаў грошы ад Літвы?

Ленк. Не ведаю. Знаю толькі, што на гэтыя грошы ён купіў дамы ў Горадні.

Абар. Бабянскі. Сьведка быў назначаны начальнікам Сакольскага пав.?

Ленк. Але.

Аб. Бабянскі. А ў вашым павеце быў ужо свой аддзел партызанаў ці яго арганізаваў сам сьведка?

Ленк. Не, тады яшчэ ня было ні паўстанцаў, ні аружжа.

Аб. Бабянскі. Значыцца ўсё, што пасьля зроблена ў Сакольскім павецё, зроблена сьведкам, як начальнікам павету?

Ленк. Не. Там ужо працавалі да мяне Маслоўская, Гораш і інш.

Аб. Бабянскі. Але-ж яны нічога не зрабілі. Што-ж рабіў сам сьведка?

Ленкевіч маўчыць.

Аб. Бабянскі: Сьведка добра памятае, калі ён заявіў паліцыі аб арганізацыі?

Ленк. 15—16 лютага.

Аб. Бабянскі. Значыцца, зараз-жа пасьля таго, як вярнуўся з Мэрача?

Ленк. Так.

Аб. Бабянскі. Ну, а пасьля заявы ў паліцыю, сьведка і далей працаваў у арганізацыі, падтрымліваў зносіны з Маслоўскай, Матэйчук і інш?

Ленк Так, бачыўся з імі.

Аб. Бабянскі. Сьведка на ўласныя вочы бачыў склады аружжа ў Мэрачы? Ну, а куды перавозілася з гэтага цэнтральнага складу аружжа на гэты бок граніцы? У якія іменна пункты, сьведку гэтага ў Штабе не гаварылі? Сьведка не назваў ніводнага складу аружжа ў Горадзеншчыне. Сьведка ня бачыў іх, ці іх зусім ня было? Бо калі аружжа перавозілася возамі, калі не вагонамі, дык яго павінны былі шмат знайсьці, і сьведка лёгка мог даведацца ў Штабе, каму яго перадавалі на схаваньне?

Ленк. Я добра ня ведаю. Ведаю толькі, што Карповіч вазіў аружжа ў Лідзкі павет.

Абар. Міцкевіч. Дзе сьведка служыў у Расеі?

Ленк. Я быў санітарам і езьдзіў з цягнікам. Быў шмат у якіх гарадох Расеі.

Абар. Міцкевіч. А ці ня служыў сьведка ў чрэзвычайцы ў бальшавікоў?

Прадс. нявыразна пратэстуе проціў такога пытаньня, але абаронца Міцкевіч вымагае адказа Ленкевіча, кажучы, што мае некаторыя даныя цьвердзіць гэтае і гэтыя весткі ён хоча праверыць.

(Працяг будзе)

ў Францыі. І ўсе левыя групы паслоў, якія звычайна паміж сабой востра змагаюцца, гэтым разам выступалі згодна і дружна проці манархістаў: радыкалы, радыкальныя сацыялісты, сацыялісты, камуністы сваімі галасамі стварылі большасьць, якая і пастанавіла надрукаваць і расклеіць па ўсей Францыі лепшыя прамовы ў парляманце проці манархістаў.

Урад заявіў, што добра ведае аб усей манархічнай арганізацыі, што робіць напады, і востра з ей расправіцца.

Польшча. Урад уносіць да Сойму праэкт аб назначэньні ганаровай пэнсыі да канца жыцьця б. Прэзыдэнтам Польскай Дзяржавы, а так сама іхным удовам і сіротам.

Да Варшавы прыбыла дэлегацыя міжнароднага саюзу горнарабочых; апрача нарад дэлегацыя мае на мэце азнаёміцца з палітычным і эканамічным палажэньнем Польшчы.

Газэты паведамляюць, што хутка будзе выданы загад, забараняючы польскім грамадзянам ўезд да Гданска. Праезд пасажыраў праз абшар Гданска будзе адбывацца ў замкнутых цягніках. Пагранічныя польскія ўлады будуць штампляваць пашпарты пры ўезьдзе і выязьдзе на Гданскую тэрыторыю. За астаноўкі і прабываньне на тэрыторыі вольнага гораду вінаватыя будуць пацягнуты да цяжкай адказнасьці. Толькі купцы і прамыслоўцы, якія выясьняць мэты падарожы змогуць затрымлівацца ў Гданску.

Кража судовых папераў.

У Варшаўскім Судзе скрадзены дакументы і ўсе паперы з так званай справы „11 сьнежня" г. з. ў справе Варшаўскіх беспарадкаў 11 сьнежня 1922 году забіцьця першага польскага празыдэнта Нарутовіча. Кража тых дакумэнтаў мае палітычны характар.

Зямелчны кодэкс у Сав. Беларусі.

Часовая перадача правоў на карыстаньне зямлею.

Бываюць такія выпадкі, калі гаспадар зямлі ня можа па тых ці іншых прычынах карыстацца зямлёю сам. Прычынаю можа служыць недарод, пажар, падзеж жывёлы, недахват інвэнтару ці рабочай сілы і г. г Далей, гаспадар можа быць мабілізаваны, выбраны на якую-небудзь савецкую грамадзянскую працу, можа адлучыцца на заработкі ў другое мейсца. Ва ўсіх гэтых выпадках гаспадарка, застаўшыся без гаспадара, слабее Дзеля таго, каб ня даць ёй упасьці, яе можна здаваць ў арэнду за грошы, за прадукты і г. д.

Здаваць можна толькі на такі час' які патрэбен для аднаго севазвароту. Пры трохпольнай сыстэме—на тры гады, пры чатырохпольнай—на чатыры гады і г. д.; пры адсутнасьці пэўнага севазвароту—ня больш, як на тры гады. У некаторых выпадках тэрмін арэнды можа быць, з дазволу вал. вык. камітэту, працягнуты, але ня больш двайнога севазвароту, а пры адсутнасьці пэўнага севазвароту—на больш, як на 6 гадоў. Калі-ж па сканчэньні гэтага тэрміну гаспадар зямлі ня зможа працаваць на ёй сам, дык далейшы дазвол на здачу ў аренду могуць даць толькі павятовыя зямельныя органы. У праціўным выпадку зямля залічваецца ў зямельны фонд для здаваленьня патрэбнасьцяў працоўнага жыхарства.

Як ія умовы здачы зямлі у арэнду.

Арэнда можа быць толькі працоўная, і ніхто ня можа ўзяць у арэнду зямлі больш, чым ён можа сам апрацаваць. Арэндныя дагаворы ці дадатковыя дагаворныя умовы маюць вагу толькі пасьля зарэгістраваньня іх у мясцовых валасных выканаўчых камітэтах.

Дагавор можа быць як пісьменны, так і вусны. Вусны дагавор павінен быць выказаны гаспадаром і арэндатарам у прысутнасьці сябра валаснога выканаўчага камітэту і запісаны ў асобную кнігу дагавораў. Ня можна здаваць зямлі ў арэнду, калі гаспадар пакідае вядзеньне самастойнай гаспадаркі назаўсёды і пераходзе да іншай працы.

Умовы працы арандатара.

Па дагавору, арандатар павінен старанна працаваць на зямлі і ня мае права перадаваць яе другім асобам. Усе зборы, падаткі і г. д. з арэнднай зямлі плапіь арандатар за ўвесь тэрмін арэнды. У дагаворы павінны быць адзначаны тыя паляпшэньні, якія арандатар павінен правесьці, а таксама і спосабы разьліку з гаспадаром, у выпадку няпоўнага гаспадарчага выкарыстаньня.

Дагавор можа быць зьнішчаны па патрабаваньню гаспадара зямлі ці зямельных органаў, калі арандатар ня выканаў дагавору ці вышэй-пералічаных умоваў. Усе спрэчкі па гэтаму праводзяцца ў парадку зямельных спораў.

Канец арэнды.

Па сканчэньні тэрміну арэнды зямля зьвяртаецца гаспадару са ўсімі паляпшэньнямі, зробленымі арандатарам, прычым узаемныя разьлікі робяцца на грунце дагавору.

Нагляд за правідловым выканеньнем умоваў арэнды і разгляд усіх спрэчак па выкананьню дагавору належаць да зямельных камісіяў, а растаржэньне дагавораў робіць народны суд.

П. Р.

Карэспандэнцыі.

Людзі замест коней.

Пішуць нам са *Слонімск. пав.*, што робіць пастэрунак паліцыі ў мястэчку Молчадзь у гэтым павеце

12 мая ў вёску Цетаўлі, Новамыскай вол., Баранавіцкага пав. прыехалі паліцыянты, шукаючы быццам сьсечанага бяспраўна дрэва. У грамадзяніна Ліпкевіча знайшлі нейкае сьсечанае дрэва, якое ўзялі ды ўзвалілі на воз. Дзеля таго, што коней ня было, паліцыянты, чакаючы іх, загадалі даць сабе гарэлкі і, здорава выпіўшы, рашылі, што коні не патрэбны, бо дрэвы могуць завесьці самі сяляне.

Дык прыгналі колькі малалетак—Вінцэнта Марача, 10 гадоў, Антона Прыхода, 14 гадоў, Захара Рамашку, 15 гадоў ды колькі іншых яшчэ, *запраглі іх да возу з дровамі* і паехалі ў Малчадзь, якая ляжыць за 10 вярстоў, на пастэрунак паліцыі.

Калі гэтакі дзіўны воз ехаў міма аднэй хаты, дзе спраўлялі вясельле, моладзь гуляла ды сьмяялася. Пьяны паліцыянт пачуўшы сьмех, думаў, што гэта з яго сьмяюцца, уляцеў у хату, кінуўся на маладую дзяўчыну Алёну Гаўдзей, пачаў яе біць і парваў ёй хустку і адзежу.

Калі стары Мацей Галец, якому ўжо 70 гадоў, зьвярнуў увагу паліцыянту, што гэтак рабіць ня гожа, паліцыянт ударыў яго стрэльбай па галаве, у грудзі і ў сьпіну — стары ўпаў абліваючыся крывёй.

Пабачыўшы гэта дзеці і моладзь пачалі крычаць, на іхні крык збегліся людзі, і паліцыянт спалохаўшыся уцёк.

У вечары ў той самы дзень прыехалі ў Цешаўлі пяць паліцыянтаў, якія паднялі з ложка раненага Мацея Гальца, пабілі яшчэ колькі мужчын з вёскі, арыштавалі Алёну Гаўдзей *за тое, што яна сьмяялася з паліцыі*, а старасту з вёскі Цешаўлі арыштавалі за тое, быццам ён бунтаваў людзей — і ўсіх павезлі ў вастрог у Слонім.

Гэтак вось дзеецца на вёсцы: да Бога высока, да Сойму далёка; дык цярпі, бедны мужык, розны зьдзек і гвалт мясцовых панкоў і ураднікаў.

(„Нар. Выз.").

З Менску.

Сэмінарыі па беларускай літэратуры у Бел. Дзяр. Унівэрсытэце.

1922-23 акадэмічны год для студэнтаў этнолёга-лінгвістычнага аддзяленьня даў шырокую магчымасьць заняцца навукова-крытычнымі досьледамі беларускай літэратуры, што яскрава выявілася ў сэмінарскіх працах пад кіраўніцтвам праф. Замоціна на другім курсе і праф. Пятуховіча на першым.

Перш за ўсё трэба падкрэсьліць, што сэмінарскія працы праз ўвесь год праходзілі вельмі бадзёра і жвава.

Беларуская літэратура мала яшчэ мае навуковых дасьледзінаў і ўяўляе сабою цэлыя стагі сырога матэр'ялу.

З гэтае прычыны, якую-б тэму з яе мы ня ўзялі, кожная з іх пахне сьвежаю цаліною, па якой не прайошў бліскучы плуг крытычнага аналізу. Кожная з іх цікавая для беларускага студэнцтва.

Тыя рэфэраты, якія разглядаліся на сэмінарыях, вельмі розналкалёрны. Сярод іх мы знаходзім крытыку на вышаўшую нядаўна кнігу акадэміка Е. Ф. Карскага «Белорусы», у якой ён разглядае беларускую навейшую літэратуру і беларускі рух.

Далей чыталіся рэфэраты, у якіх разглядаліся матывы лірыкі беларускіх песьняроў, якія зьяўляюцца прадстаўнікамі беларускай літэратуры другое паловы 19 і 20 сталецьця да нашых дзён, як сацыяльныя матывы лірыкі Багушэвіча, Янкі Купалы.

Прыродаапісальныя матывы лірыкі Алеся Гаруна.

Потым маем рэфэраты, напісаныя на тэму „Генэзіс новай беларускай літэратуры" і г. д.

Але на сэмінарскіх працах разглядаюцца ня толькі матывы мастацкай літэратуру. На першым курсе шырока разьвярнулася сэм. праца па досьледах беларускага фальклёру.

Некаторымі студэнтамі зроблена клясыфікацыя і разгляд матываў беларускіх казак, лэгэндаў; глыбокі аналіз і досьледы абрадавай і бытавой паэзіі і г. д.

1922—23 акадэмічны год канчаецца. Студэнты-удзельнікі сэмінарыяў вынясьлі з іх шмат карысьці.

Студэнт.

Жыў на сьвеце гаспадар.

Гаспадар меў кватэры і кватэрантаў, але кватэранты не плацілі грошай, а гаспадар ня меў з чаго жыць.

Ен аб'явіў, што кватэры ў яго здаюцца, але старыя кватаранты іі ня думалі прабрацца з месца.

Прыходзілі новыя кватэранты, глядзелі занятыя старымі кватэрантамі кватэры і пыталіся:

— Ну, а як-жаж будзе са старымі кватэрантамі?

— Яны выедуць. Я падаў у суд і выйграў. Іх каморнік выкіне. Адказваў ціха гаспадар.

— Дык я вам дам задатак, але кватэра, як будзе свабодна, будзе за мной пытаўся новы кватарант.

— Бязумоўна!—адказваў гаспадар і браў задаткі.

Новыя кватэранты ўсё ішлі ды йшлі ды цешыліся, што знайшлі кватэру ды давалі задаткі, а старыя кватаранты, так як раней не краталіся з занятай імі кватэры.

Новыя кватэранты даўней, даўшыя задаткі пачалі неспакоіцца:

— Калі ж будзе кватэра?.

— Пачакайце яшчэ тыдзень..

Чакалі і тыдзень, і два, і тры, і пачалі яшчэ больш неспакоіцца. У канцы канцоў пачалі вымагаць ад гаспадара, каб вярнуў зндаткі.

Гаспадар вяртаў.

Тыя хто наймаў кватэру ў студні 1922 г., даў 50.000 задатку. Праз паў году—ў чэрвені—атрымаў усе свае грошы назад.

— Калі ня хочаце чакаць, вось ваш задатак!—адказваў згодны на ўсё гаспадар.

Тыя хто наймаў тую самую кватэру у сакавіку прошлага году, даваў ужо 150.000 задатку—і гаспадар у верасьні вярнуў яму грошы.

Тыя, хто наймалі кватэру ў чэрвені мінулага году, давалі 500.000 і сёлета атрымоўвалі назад свае грошы.

А тыя, хто дае цяпер яму задатак, даюць мільёны, і праз паў году, як польская валюта ўпадзе яшчэ шмат ніжэй, атрымаюць назад свой задатак.

І жыве гаспадар, жывуць старыя кватэранты, толькі новыя дарма ходзяць і даведываюцца, ці кватэра ўжо свабодна, а ў канцы канцоў, ня маючы цярплівасьці чакаць, адбіраюць свой задатак.

Зусім як казка, але не зусім казка.

Лябеда.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня**, Віленская вул. 12 кв. 6.

2) **Ліда**, II Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.

3) **м. Глыбокае**, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.

4) **Жодзішні**, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.

5) **Навагрудак**, Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.

6) **Нясьвіж**, Альбянская 28, сэкр. Ян Шнаркевіч.

7) **Столбцы**. Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.

8) **Баранавічы**

9) **Горадчя**, Мастовая 9.

10) **Валкавыск**, Пяскова 14.

11) **Бельск**, Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.

12) **м. Сакольна**, Горадзенская вул. 34.

13) **м. Клешчэлі**, Бельск. павету.

14) **м. Крынкі**, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.

15) **Пружаны**. Вул. кс. Буткевіча, 16

Рэдактар-выдавец В. Прохараў.

Друкарня А. Дворжэца, Завальная 32.